

LA TROUPPE FRANCOPHONIE «ATELIER»: «LE MUR» THEATRAL ET LES PONTS CULTURELS

ФРАНКАФОННАЯ ТРУПА «АТЭЛЬЕ»: ТЭАТРАЛЬНАЯ «СЦЯНА» І КУЛЬТУРНЫЯ МАСТЫ

Ідзе рэпетыцыя. «Добры вечар, я прыйшла ўзяць у вас інтэрв'ю». — «Калі ласка, заходзь, мы чакалі!»

Каця Ш.: — Усё пачалося з таго, што мне патэлефанаваў мой выкладчык французскай мовы Дзяніс Кажарын: ёсць, маўляў, магчымасць паехаць на фестываль франкафонных тэатраў у Познань — для гэтага патрэбна трупа студэнтаў, якая паставіць спектакль з прапанаванага спісу. Ідэя мяне захапіла, бо я ўжо 10 год займаюся ў аматарскім тэатры, але толькі як актрыса. Вельмі цікава было паглядзець, як будуць іграць разам людзі, між сабою ніяк не звязаныя. Гэта быў лёс! Ад пачатку мне хацелася рэалізаваць гэты праект з даволі слабымі студэнтамі, якія вывучаюць французскую толькі першы год, каб яны зразумелі, што такое на самай справе французская мова, і ўбачылі перспектыву сваёй працы. Я ўжо апусціла рукі, калі сустрэла адну дзяўчыну, якая сказала мне: «Давай я знайду табе людзей». «Ну, добра», — адказала я. Вось так мы і сабраліся.

Аня: — Да таго ж, мы ўсе тут удзельнікі алімпіяд, у тым ліку і рэспубліканскага этапу, так што французская ў нас на добрым узроўні!

Каця Ш.: — Першыя два месяцы мы прыглядаліся адно да аднаго і рэпетыравалі там, дзе была магчымасць.

Аня: — Каля банкаматаў, у корпусе «Г», у Парку Горкага…

Каця Ш.: — Рэпетыцый на сцэне ў нас было толькі тры…

Каця К.: — І адна з іх ужо на сцэне фестывалю ў Познані. Наша п'еса называлася «Сцяна». Яе аўтар, Ціеры Сімон, меў на ўвазе сцяну сапраўдную, матэрыяльную.

Каця Ш.: — А ў нас сцяна — не знешняя перашкода, а ўнутраная: нашыя перадузятасці і страхі, якія не даюць нам рухацца далей. Калі ты пераможаш «сцяну» ўнутры сябе, то і ў рэальным жыцці ты ўсё пераадолееш.

Каця К.: — Мы прыдумалі, што «Сцяна» — гэта шоу на тэлебачанні, і там сабраліся, натуральна, людзі розных прафесій, заняткаў,

дастатку і здольнасцей. У п'есе было 12 персанажаў, але з-за таго, што нас усяго шасцёра, мы падзялілі словы так, што атрымалася шэсць герояў, і кожны з іх — асоба…

Каця Ш.: — Нашая ідэя была ў тым, каб увасобіць тыпажы сучаснага грамадства.

Аня: — Я, напрыклад, была «бізнеслэдзі», жонкай багатага банкіра, сама — віцэпрэзідэнт французскага банка. А прыняць удзел у гэтым шоу вырашыла з-за таго, што мне было нудна жыць і трэба было паспрабаваць у жыцці чаго-небудзь новенькага.

Каця П.: — А я была мадэллю, летуценніцай, усім расказвала пра тое, якія сны мне сняцца, усім дурыла галаву — і мяне там не надта любілі.

Андрэй: — Я іграў ролю няўдачлівага акцёра, у якога былі вялікія грашовыя праблемы. Я быў «сынком», моцна прывязаным да сваёй маці, якая заўсёды казала, што рабіць. Параіла пайсці на шоу — і я пайшоў, каб знайсці спонсараў і раскруціцца.

Каця К.: — А дзяўчаты яго стараліся загнабіць!

Каця Ш.: — Я на яго крычала болей за ўсіх!.. Шчыра кажучы, я была самым тыповым з усіх герояў — настаўніцай. Як бы гэта ні было дзіўна, я лічу, што ведаю ўсё, але на самай справе — толькі ў разрэзе кніжкі. Я нічога не ведаю пра сапраўднае жыццё і разумею, што ўсе мае веды — гэта тэорыя.

Маша: — Я з'яўляюся тут дурненькай афіцыянткай, якая перыядычна «разумнічае», але ўвогуле нічога з сябе не ўяўляе, хоць сама пра сябе і лепшай думкі. І трапіла яна сюды, бо хоча прарвацца на тэлебачанне, пазнаёміцца з Дзюжардэнам (*Жан Дзюжардэн (Jean Dujardin) — французскі шоумен і акцёр («99 франкаў», «Артыст»)),* іншымі знакамітасцямі…

Каця К.: — Кожны персанаж у нашым спектаклі праходзіць праз пэўныя змены, але не абавязкова ў лепшы бок. У мяне быў персанаж — навуковы супрацоўнік, у нейкім сэнсе мізантроп, які лічыць, што ўсе людзі тут — ідыёты і «лепей я буду трымацца збоку і назіраць за вамі. У шоу я ўдзельнічаю, бо праспорыла. Мне ўсё да лямпачкі, «вырашайце ўсё самі», часам магу каму-небудзь выказаць, што ён — ідыёт, паспрачацца з кім-небудзь. Але напрыканцы спектакля я раблюся бліжэйшай да людзей.

Каця П.: — Каб паўдзельнічаць у конкурсе, трэба было даслаць заяўку і відэа. Мы знялі нібыта ўрыўкі з відэазапісу кастынгу нашых герояў на тэлешоу.

Каця К.: — Трэйлер, што ні кажы!

Каця Ш.: — Хоць, увогуле, трэба было паказаць толькі ўрыўкі са спектакля, але яго на той час яшчэ не было, мы толькі пачалі рэпетыраваць першыя сцэны, іх мы таксама запісалі для заяўкі.

Каця П.: — Але нам потым казалі, што наша відэа вельмі заінтрыгавала!

Аня: — А ўвогуле заяўкі падавалі 14 краін, з іх выбралі 6 — у тым ліку і нас. Да Познані дабіраліся на ве-ельмі камфартабельным мікрааўтобусе, прадастаўленым Амбасадай Французскай Рэспублікі! Выкладчык, які прапанаваў нам паехаць на гэты фестываль, Дзяніс Кажарын…

Каця К.: — Ён — прэзідэнт Асацыяцыі выкладчыкаў французскай мовы ў Беларусі…

Аня: — …і ён дамовіўся, каб культурны аддзел французскай амбасады пасадзейнічаў нам.

Каця К.: — І аддзел цалкам аплаціў нам дарогу і дапамог з візамі.

Каця Ш.: — Мы жылі ў цэнтры горада, у трох секундах ад галоўнай плошчы.

Маша: — І да тэатра, да чаго заўгодна — крок ступіць.

Аня: — Мы жылі ў хостале, у пакоі было 6 ложкаў…

Андрэй: — ...і адна раскладушка!

Аня: — Але ў нас было столькі мерапрыемстваў, майстар-класаў, што мы там амаль не з'яўляліся.

Каця Ш.: — Доўжыўся фестываль 5 дзён.

Аня: — Нам дапамагаў валанцёр Віця, наш тэхнічны дырэктар. У дзень нашага выступлення, раніцай, калі мы рэпетыравалі, ён, напэўна, падумаў, што наш спектакль зусім не высокага ўзроўню. Мы адно на аднаго крычалі, але такія спрэчкі былі, бо не маглі ўключыць музыку...

Каця П.: — А калі мы толькі выйшлі за кулісы, падбег да нас: «Я бачыў ваш спектакль!»

Аня: — Журы і гледачы былі ў захапленні ад таго, як мы без дэкарацый змаглі ства-



КАЦЯРЫНА ШАГОЙКА, 23 гады (МДЛУ, выкладчык французскай) — энергічная дзяўчына з кучарашкамі;

КАЦЯРЫНА ПУСТАХОД, 19 год (МДЛУ, студэнтка факультэта міжкультурных камунікацый) — дзяўчына з добрай усмешкай і мадэльным ростам;

ГАННА САВІЦКАЯ, 19 год (МДЛУ, студэнтка перакладчыцкага факультэта) — мілая брунетка з захопленымі вачыма;

АНДРЭЙ КУЛІЕЎ, 19 год (БДЭУ, студэнт) — асоба мужчынскага полу;

КАЦЯРЫНА КАНАПЛЁВА, 19 год (МДЛУ, студэнтка ФМК) — упэўненая брунетка з кароткай стрыжкай;

МАРЫЯ ШАШУТКІНА, 19 год (МДЛУ, студэнтка ФМК) — эфектная высокая брунетка. Усе — акцёры франкафоннай трупы «АТЭЛЬЕ».

рыць атмасферу такога квадрата, быццам перад намі сцяна.

Андрэй: — А мы выкарысталі эфект «чацвёртай сцяны»…

Каця Ш.: — Толькі мы пра гэта самі не ведалі!

Андрэй: — Мы ніяк не ўзаемадзейнічалі з гледачамі, камунікавалі толькі паміж сабой.

Каця П.: — І здолелі дабіцца эфекту.

Каця К.: — А я хачу дадаць, што з 6 труп мы адны былі аматарамі — усе астатнія вучацца на тэатральных факультэтах. На самай справе гэта выдатна, што ва Усходняй Еўропе ладзяцца франкафонныя мерапрыемствы.

Каця К.: — А то паўсюль «ангельцы», «ангельцы» ды «ангельцы»…

Аня: — Нам падарылі 5 кніг з добрымі п’есамі сучасных французскіх, бельгійскіх ды іншых франкафонных драматургаў.

Каця Ш.: — Калі мы паедзем на наступны фестываль у Познань, то нам зноў трэба будзе выбраць п’есу са спісу, які нам прапануюць арганізатары.

Каця К.: — Мы падалі заяўку на фестываль у Бельгію і Парыж, але ёсць думкі і пра новы спектакль.

Каця Ш.: — Французская мова існуе не толькі для таго, каб вучыць яе на нудных парах і выконваць нейкія заданні, але для таго, каб рэалізоўвацца ў жыцці.

Каця П: Не трэба баяцца, калі ёсць нейкая ідэя, шанец! Чаму б не паспрабаваць? Мы рызыкнулі — і гэта было класна!

Задавала пытанні Яна Владыка, група 310, факультэт міжкультурных камунікацый, МДЛУ.